ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
23
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 15(1536)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЕННЯ · ЗАЎТРА*

### НА ГЕАГРАФІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

падпісан дагавор аб супрацоўніцтве і дружбе з Карэйскім зямляцтвам студэнтаў. Намечаны шэраг цікавых мерапрыемстваў, вечароў, сустрэч.

Дагавор уступіў у сілу. Карэйскія студэнты расказалі пра сваю радзіму, адказалі на шматлікія пытанні аб эканамічным і палітычным жыцці Карэі, сістэме навучання, любімых занятках карэйскай моладзі. Кіраўніцтва факультэта, камітэт камсамола спадзяюцца, што супрацоўніцтва будзе ўзаемакарысным.

І. КАБАК,
студэнтка геаграфічнага факультэта.

### ТЫДЗЕНЬ

савецка-кубінскай дружбы адбыўся ва універсітэце. У час правядзення тыдня быў заключан дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж кубінскім зямляцтвам і механіка-матэматычным факультэтам. У вострай барацьбе прайшлі валейбольная сустрэча, гульня «Што? Дзе? Калі?». Не абышлося ў гэтыя дні без песняў, танцаў, вясёлай студэнцкай дыскатэкі.

В. РАМАН.

### ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ

студэнцкі палітычны кірмаш, прысвечаны Міжнароднаму Дню салідарнасці моладзі і 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, адбудзецца 28 красавіка. Кірмаш пачнецца ў 17.00 у Доме настаўніка (па вул. Ульянаўскай, 8).

У праграме кірмашу — нацыянальныя выстаўкі зямляцтваў і арганізацый замежных студэнтаў, сустрэчы з калектывамі мастацкай самадзейнасці, выступленні вакальна-інструментальных ансамбляў і танцавальная праграма, выстаўка палітычнага плаката, віктарыны, атракцыёны, кірмаш нацыянальных сувеніраў народаў свету.

Ж. КРУГЛІКАВА.

### ШТОГОД

ва універсітэце фарміруецца звыш 80 студэнцкіх атрадаў. Але сярод іх ёсць адзін, які самым непасрэдным чынам мае дачыненне да работы інтэрсектара камітэта камсамола. Байцы працуюць са слухачамі курсаў рускай мовы, што прыязджаюць у нашу краіну з розных куткоў свету. Мне пашанцавала быць байцом такога атрада, які прымаў гасцей з ГДР,— яны прыехалі ў СССР, каб удасканаліць свае веды ў рускай мове, бліжэй пазнаёміцца з нашай краінай. Надоўга запомніцца мне і маім сяброўкам Але Бодак, Галі Дзячэнка, Ладзе Балендзе работа ў ідэалагічным атрадзе.

Л. РАДЗЬКОВА,
студэнтка юрыдычнага факультэта.

*Аўтаінтэрв'ю*

## «У мяне атрымаецца»



*УЖО ЧАТЫРЫ ГАДЫ жыву я ў Савецкім Саюзе. Можна лічыць, што мне пашанцавала, таму што раней я ведаў пра вашу краіну толькі з газет і паведамленняў. І зараз пераканаўся ў правільнасці прыказкі: «Лепей адзін раз убачыць...»*

*Не, я ніводнай хвіліны не сумняваўся, што Савецкі Саюз — лепшая з краін, дзе я магу атрымаць адукацыю. Многае даведаўся я за гэты час аб савецкай рэчаіснасці і маёй будучай прафесіі — журналістыцы.*

*Дзе я быў? Што бачыў? Скажу па сакрэту: Мінск ведаю амаль да апошняга прыпынку. Быў у Вільнюсе і Брэсце, Кіеве і Віцебску. Тры працоўныя семестры правёў у будаўнічым атрадзе. Бачыў Пскоў і Кішынёў. даведаўся аб жыцці вёсак і гарадоў.*

*Ну і як? На мой погляд, цудоўна!*

*Планы? Не пералічыць іх на маленькім кавалачку газетнай плошчы. Мне вельмі добра тут, але ж і дома хочацца апынуцца як мага хутчэй. Там мяне чакаюць. Чакае радзіма. Чакаюць родныя. Там я вазьму ў рукі вострае пяро, каб ахоўваць радзіму і рэвалюцыю.*

*Яшчэ я хацеў сказаць вам, мае сябры, што бачыў грандыёзныя дасягненні вашага народа ў пабудове сацыялістычнага грамадства, паслядоўную барацьбу за ўмацаванне міру на планеце. Я зразумеў сутнасць той дамамогі, якую атрымліваем мы ад вашай краіны.*

*Мая задача і заключаецца ў тым, каб расказаць усяму свайму народу аб вашай краіне. Я лічу: у мяне атрымаецца.*

*Гебрымарыям САЛАМОН,*
*студэнт міжнароднага аддзялення факультэта журналістыкі.*

*НА ЗДЫМКУ: Гебрымарыям Саламон.*

*Фота А. МАКСІМАВА.*

Няхай жыве 1 Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных.

(З Заклікаў ЦК КПСС).




*З нашай пошты*

## Непаўторныя дні

ЗА ГАДЫ МАЁЙ вучобы ў Мінску было шмат цікавага, запамінальнага. Але, бадай, самы яркі, дарагі, незабыўны мой успамін — пра фестываль моладзі і студэнтаў у Маскве. На XII Сусветным я быў членам аманскай нацыянальнай дэлегацыі. Каб расказаць пра фестываль, мне не хопіць ні абмежаваных радкоў, ні часу, бо фестываль — гэта цэлы кавалак неверагодна насычанага жыцця.

Мне давялося сустракацца і гутарыць з моладдзю розных краін свету. І нічога, што я не ведаў іх мовы, а яны не разумелі маёй. Агульная мова знайшлася. Гэта была мова салідарнасці, барацьбы за мір, за шчасце.

Я ніколі не забуду тыя фестывальныя дні, масквічоў, што віталі нас.

Я яшчэ болей палюбіў савецкі народ. І мае студэнцкія гады заўсёды будуць асацыіравацца з гэтай падзеяй у жыцці моладзі нашай планеты.

АХМЕД АЛІ МУХАМАД,
выпускнік факультэта журналістыкі 1986 года.

*Школа будучага — школа творчасці*

## ПЕРШАЯ!

Як часта пра гэта ўзнікаюць спрэчкі! Адны гавораць, што педагогам нельга стаць — ім трэба нарадзіцца. Хто нарадзіўся без педагагічнай душы і таленту, без любві да дзяцей, таго не зробіш настаўнікам, хоць 5 ці 20 гадоў вучы ў ВНУ. Іншыя адстойваюць пазіцыю: педагогам можна не толькі нарадзіцца, але і стаць, бо ВНУ, як правіла, дапамагае вызначыць прызванне ў тых, хто не ведаў сваіх сіл і прыхільнасцей. Нярэдка ўдаецца прывіць любоў да будучай прафесіі тым студэнтам, якія прыйшлі ва універсітэт на педагагічнае аддзяленне ў выніку кампрамісу са сваімі марамі... Дзе ж ісціна? Як разумець словы: «Быць сапраўдным савецкім педагогам! Быць, а не здавацца ім!»?

НА ГЭТЫЯ і іншыя прынцыповыя пытанні вельмі цікава і змястоўна адказалі ўдзельнікі першай педагагічнай алімпіяды «Школа будучага — школа творчасці», якая прайшла ва універсітэце.

Вядома, што прафесія педагога адна з самых старажытных і складаных. Высокі прафесійны ўзровень, тактоўнасць і чуласць, дабрыня і спагадлівасць, натхнёнасць і шчырасць, бескарыслівасць, справядлівасць і самавалоданне — вось далёка не поўны пералік якасцей сучаснага настаўніка. І мы з задавальненнем адзначаем, што ў асноўным усе прадстаўнікі факультэтаў, якія спаборнічалі на гэтай алімпіядзе, маюць такія якасці. У ходзе «барацьбы» студэнты прадэманстравалі глыбокія веды ў галіне тэорыі і гісторыі педагогікі, методыкі правядзення ўрока, высокую эрудыцыю і педагагічную культуру.

Асаблівую цікавасць у удзельнікаў і гледачоў выклікаў конкурс «Ролевае рашэнне педагагічнай задачы», які з'яўляецца цудоўнай формай трэніроўкі многіх элементаў педагагічнай тэхнікі, развіцця педагагічных здольнасцей. Гарачыя «баталіі» разгортваліся не толькі на сцэне. Высокі ўзровень падрыхтоўкі лепшых каманд прымушаў спрачацца і членаў аўтарытэтнага журы.

Пасля падвядзення вынікаў вызначыліся пераможцы. Наперадзе — каманда біялагічнага факультэта (капітан А. Крывашэеў), за біёлагамі ў выніковай табліцы — хімікі. Усяго некалькі балаў не хапіла мехматаўцам (недабралі ў конкурсе па выкарыстанню ТСН), каб узняцца вышэй свайго III месца. Значна слабей былі падрыхтаваны і выступілі каманды беларускага аддзялення філалагічнага і геаграфічнага факультэтаў. Ды і колькаснасць студэнтаў гэтых каманд была намнога ніжэй жадаемага. Здзіўляе і тое, чаму ў алімпіядзе не прымалі ўдзел студэнты гістарычнага, фізічнага, рускага аддзялення філалагічнага факультэтаў?

Па завяршэнню алімпіяды сфарміравалася зборная каманда нашага універсітэта. У хуткім часе, а дакладней, на гэтых днях, можна будзе даведацца пра тое, як яна выступіла на рэспубліканскай педагагічнай алімпіядзе ў Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага. У саставе зборнай — у асноўным біёлагі. Гэта Аляксандр Крывашэеў, Аляксандр Монгін, Сяргей Сакалоўскі, а таксама Алена Гур'янава (мехмат), Ірына Жыхар (хімфак), Вольга Мароз (філфак).

Зразумела, хочацца пажадаць, каб першая алімпіяда стала традыцыйнай. Яна карысная для студэнтаў, бо дапамагае спалучыць тэарэтычныя і практычныя веды, адчуць упэўненасць у сабе, сваіх сілах, натхняе марыць пра школу радасці, школу будучага і ствараць яе, пераадольваючы коснасць. Яна патрэбна выкладчыкам, бо з'яўляецца не толькі добрай формай прыцягнення студэнтаў да актыўнай дзейнасці па асэнсаванню працы настаўніка, яго ролі ў грамадстве. Гэта адзін з дзейсных шляхоў павышэння псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі будучага настаўніка, узняць узровень якой патрабуе рэформа школы і ВНУ. А галоўнае — гэта магчымасць удасканальваць зносіны, якая падмацоўвае новыя інтарэсы, новыя мэты.

Т. МІХНЕВІЧ,
І. ЦІХАНАВА.

## Мы — інтэрнацыяналісты

*ШТО ВЫЗНАЧАЕ Іру Мядзведзеву? Сумленнасць, чалавечая абаяльнасць, мэтанакіраванасць, працаздольнасць. Мяркуйце самі: за час, калі Іра адказвала за інтэрнацыянальнае выхаванне ў камітэце камсамола фізфака, факультэт па інтэррабоце падняўся з адзінаццатага на другое месца. Лічбы, як кажуць, гавораць самі за сябе. Зараз Іра ўжо на пятым курсе, вось-вось пачнецца самастойная праца. Будуць іншыя інтарэсы, праблемы, але, безумоўна, яна застанецца такой жа ініцыятыўнай, апантанай у сваёй справе.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*



## СТУДЭНТ У ЦЭХУ

*Увага: вопыт*

Як забяспечыць своечасовую падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для народнай гаспадаркі, якая хутка абнаўляецца? Аналіз існуючых рэзерваў, які мы, супрацоўнікі аддзела тэхнічнага навучання ВА «Інтэграл», правялі сумесна з супрацоўнікамі БДУ імя У. І. Леніна, прымусіў крытычна асэнсаваць змест працоўнага семестра студэнтаў. Чаму абавязкова трэба ехаць з будатрадам на край свету, калі можна з толкам выкарыстаць гэты час для практычнага авалодання будучай спецыяльнасцю?

ТАК У НАС з'явіўся круглагадовы навукова-вытворчы студэнцкі атрад «Імпульс», які працуе па профілю атрымліваемай спецыяльнасці. Студэнты трох факультэтаў працуюць у цэхах аб'яднання па асобна зацверджанаму графіку ў другую змену па чатыры гадзіны ў дзень.

Галоўнае звяно ў гэтай рабоце — тэхнічная падрыхтоўка членаў атрада па тых ці іншых прафесіях. На заводзе рыхтуюць скарочаныя вучэбныя праграмы, арганізоўваюць тэарэтычныя і практычныя заняткі і даюць членам атрада адпаведную кваліфікацыю. Толькі пасля гэтага яны допускаюцца да самастойнай працы ў цэхах.

Мы лічым, што новае студэнцкае фарміраванне можа стаць сур'ёзнай дапамогай у навучанні спецыялістаў шырокага профілю, вядучых інжынерных кадраў для прамысловых галін.

Б. МІХАЙЛЮК,
начальнік аддзела тэхнічнага
навучання ВА «Інтэграл».

## СУСЕДЗІ ПАВІННЫ ЖЫЦЬ У МІРЫ

*Нашы інтэрв'ю*

НАШУ РЭСПУБЛІКУ НАВЕДАЎ ПРАФЕСАР ЯПОНСКАГА УНІВЕРСІТЭТА КАНКО ГАКУІН ХАЙХАЦІРА АСАКІ. ІНТЭРВ'Ю Ў ЯГО ЎЗЯЎ ДЖЭЙМС АТУКА, СТУДЭНТ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ.

— Я з'яўляюся доктарам эканомікі універсітэта Канко Гакуін у горадзе Іакагама. Член аддзялення Таварыства дружбы Японія — СССР. Напісаў шэраг кніг і брашур пра эканамічнае жыццё Савецкага Саюза і еўрапейскіх сацыялістычных краін. Мэта маёй паездкі — вывучэнне ходу перабудовы ў сацыяльнай і эканамічнай галінах.

*— Вашы ўражанні ад наведвання Беларусі?*

— У СССР я прыязджаю даволі часта. Быў у Прыбалтыцы, на Далёкім Усходзе, у Сібіры, Малдавіі. А вось у Беларусі ўпершыню. Тое, што я ўбачыў, вельмі моцна мяне ўразіла. Прызнаюся, не чакаў, што Мінск такі прыгожы, сучасны горад, што ў Беларусі шмат іншых цудоўных гарадоў з развітой прамысловасцю.

Я захоплены мужнасцю і гераізмам савецкага народа ў гады другой сусветнай вайны, але я не менш захоплены яго працавітасцю, вынікам якой з'яўляецца ўсё тое, што я ўбачыў тут, у Беларусі, і ў іншых рэгіёнах Савецкага Саюза.

Знаходзячыся ў Беларусі, дзе загінуў кожны чацвёрты жыхар, я неяк асабліва востра адчуў: вайна ні ў якім выпадку не можа быць сродкам вырашэння рознагалоссяў паміж дзяржавамі. Як вучонаму, мне ўсё ясней становіцца, што агрэсіўнасць, імкненне да захопу новых рэгіёнаў збыту, а значыць — да войнаў, вынікаюць з сутнасці капіталізму.

Мне гэта не па душы, а таму я зацікавіўся эканамічнай структурай сацыялізму, стаў уважліва сачыць за жыццём у СССР, пазнаёміўся з творамі класікаў марксізму-ленінізму. Ганаруся тым, што пераклаў на японскую мову некаторыя кнігі Энгельса і Леніна, кнігу Джона Рыда «Дзесяць дзён, якія ўразілі свет». Цікавасць да СССР, мае актыўныя антываенныя перакананні прыцягнулі мяне да ўдзелу ў рабоце Таварыства Японія — СССР.

*— У якой сферы дзейнасці — навуцы, культуры, тэхніцы, вытворчасці,— на ваш погляд, хутчэй могуць знайсці ўзаемаразуменне Японія і СССР?*

— Пачынаць трэба перш за ўсё з умацавання дружбы і ўзаемаразумення паміж народамі. Японія сёння вельмі цесна звязана з ЗША у эканоміцы і палітыцы. Не сакрэт, што з сямідзесятых гадоў ЗША стымулююць мілітарызацыю Японіі, падаграюць антысавецкі настрой. Друк правячых колаў маёй краіны знаходзіцца пад вялікім уплывам ЗША. З яго публікацый у насельніцтва складваецца скажонае ўяўленне аб Савецкім Саюзе, яго палітыцы.

У сябе на радзіме я часта паўтараю рускую прымаўку: «Лепш раз убачыць, чым сто разоў пачуць». І не выпадкова, працуючы ў таварыстве, вялікую ўвагу надаю арганізацыі паездак груп японскіх спецыялістаў у СССР.

У 1982 і 1984 гадах я прывозіў у Савецкі Саюз групы японскіх эканамістаў. У гэтых групах было шмат людзей з тэндэнцыёзнымі поглядамі. Але пасля таго як яны ўбачылі ўсё сваімі вачыма, іх адносіны да СССР змяніліся. Думаю, можна знайсці шмат магчымасцей для кантактаў ва ўсіх галінах.

*— За апошнія гады Савецкай дзяржавай быў прапанаваны шэраг важных міралюбівых ініцыятыў. Як вы адносіцеся да гэтых прапаноў?*

— Наш друк не можа замоўчваць такія важныя падзеі, як сустрэчу кіраўнікоў ЗША і СССР у Рэйк'явіку, аднабаковы мараторый на ядзерныя выбухі. Але ж у рэдакцыйных каментарыях іх прадстаўляюць як прапагандысцкія акцыі, якія Савецкі Саюз, маўляў, не збіраецца выконваць. Пад уплывам ЗША многа гаворыцца пра тое, што неабходна ўцягнуць у гонку ўзбраенняў Савецкі Саюз, каб вымагаць яго. Шэраг эканамістаў паверыў у гэта, хоць гісторыя не раз даказвала правал такіх спроб.

Дарэчы, аб адносінах да гісторыі. Мяне, як многіх японцаў з цвярозым розумам, хвалюе тое, што ад нашай моладзі імкнуцца схаваць гістарычныя факты, якія, на думку кіруючай вярхушкі, ім не патрэбна ведаць. У школьных падручніках няправільна выкладаецца шэраг гістарычных момантаў. Справа дайшла да таго, што многія маладыя людзі не ведаюць, хто скінуў бомбы на Хірасіму і Нагасакі. Гэта я лічу злачынствам. Без ведання і правільнага разумення гісторыі нельга будаваць правільныя планы на будучыню, без гэтага нельга абараніць і захаваць мір.

*— Што вы хацелі б пажадаць савецкай моладзі?*

— Перш за ўсё шчасця, любві і міру. Хачу пажадаць, каб на тэрыторыі СССР больш ніколі не было вайны, каб войн не было нідзе і ніколі. Трэба навесці парадак у нашым агульным доме — на планеце Зямля і назаўсёды выкінуць на звалку гісторыі непатрэбную нікому ядзерную і іншую зброю.

## РАМАНТЫЗМ ПАЭЗІІ І... МЕТОДЫКА САМАСТОЙНАСЦІ

*На шляху перабудовы*

«К. М. БАЦЮШКАЎ І РУСКАЯ ЛІТАРАТУРА» — ПАД ТАКОЙ НАЗВАЙ ПРАЙШЛА НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ СТУДЭНЦКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ, ЯКАЯ БЫЛА ПРЫСВЕЧАНА 200-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЫДАТНАГА РУСКАГА ПАЭТА.

БАЦЮШКАЎ належыць да плеяды першых рускіх рамантыкаў, гэта адзін з вядучых мастакоў слова першай чвэрці XIX стагоддзя. Яго імя ў гісторыі рускай літаратуры па праву стаіць побач з імёнамі Дзяржавіна і Жукоўскага як непасрэднага папярэдніка А. С. Пушкіна. В. Р. Бялінскі слушна адзначаў, што «Бацюшкаў многа і многа садзейнічаў таму, што Пушкін з'явіўся іменна такім, якім ён з'явіўся рэальна».

«Настаўнік Пушкіна, чыё імяззяе ў гісторыі рускай паэзіі»,— так вызначыў Бялінскі месца паэта ў нашай літаратуры. І яно вельмі важнае. Між тым у праграме для вывучэння рускай літаратуры ў сярэдняй школе няма ніводнага твора Бацюшкава! Таму студэнты філалагічнага факультэта звычайна даведваліся пра гэтага паэта на занятках. Але сёлета, у юбілейны год, вырашана было крыху змяніць план вучэбнай работы студэнтаў.

Сакратарыят праўлення Саюза пісьменнікаў СССР стварыў спецыяльную камісію для падрыхтоўкі і святкавання юбілею, і ўжо распачата друкаванне новых даследаванняў і абагульняючых артыкулаў пра творчасць Бацюшкава, выйшлі ў свет зборнікі яго вершаў. Маючы гэта на ўвазе, выкладчыкі кафедры рускай класічнай літаратуры распрацавалі шэраг тэм, дапасавалі да іх спіс важнейшых навуковых прац пра творчасць паэта і прапанавалі студэнтам пазаўдыторна авалодаць тэмай. Кантрольная праверка іх працы дазволіла зрабіць адназначны вывад: такая самастойная работа студэнтам II курса па сіле, тэарэтычны ўзровень яе выклікаў пачуццё задавальнення. Цікавыя матэрыялы падрыхтавалі студэнты А. Кірылава, Т. Скакун, А. Кароткая, С. Кончык, Т. Мешчанка. Яны былі рэкамендаваны для ўдзелу ў студэнцкай канферэнцыі.

Арганізацыя гэтага мерапрыемства адразу ж выклікала жывы інтарэс і сярод іншых курсаў, у тым ліку ў студэнтаў вячэрняга аддзялення, членаў гуртка рускай класічнай літаратуры. І. Заплаўненка і І. Забойка, хаця яны першы год вучацца ва універсітэце, падрыхтавалі добры даклад «Тэма свабоды і незадаволенасці сацыяльнай рэчаіснасцю ў творчасці К. М. Бацюшкава». Вельмі цікава і, безумоўна, карысна было паслухаць нашым студэнтам выступленні гасцей — студэнтаў III курса Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага Н. Мелаю і І. Шарасаву.



Захапленне і творчы пад'ыход адчуваліся ў кожным выступленні студэнтаў, канферэнцыя стала сапраўдным святам паэзіі.

Цікавай яна аказалася і на думку выкладчыкаў, бо падказала вырашэнне некаторых пытанняў метадычнага плана. Абапіраючыся на палажэнні і выконваючы загад Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі № 660 «Аб развіцці ініцыятывы навукова-педагагічных калектываў вышэйшых навучальных устаноў, пашырэнні іх правоў у ажыццяўленні перабудовы вучэбнага працэсу», мы прапанавалі студэнтам не проста самастойна авалодаць зусім новай для іх тэмай, але падрыхтаваць яе на аснове найноўшых навуковых прац літаратуразнаўцаў. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што перад намі былі ў асноўным студэнты II курса, якія не маюць яшчэ вопыту напісання навуковых работ. Таму давялося нямала часу адвесці на разнастайныя кансультацыі, тлумачэнне, як правільна навукова аформіць даклад і найлепш зрабіць яго перад аўдыторыяй амаль у 90 чалавек.

Так студэнты вывучалі, а мы кантралявалі і накіроўвалі іх на самастойную работу па авалоданню зусім незнаёмай для іх раней тэмай. Зразумела, галоўны вынік гэтай працы скажацца на экзамене, які канчаткова вырашыць, ці правільны мы абралі ў даным выпадку шлях. Але ўжо сёння, абапіраючыся на ўражанні студэнтаў і выкладчыкаў, можна сказаць, што пэўны плён ад канферэнцыі ёсць.

Л. ЗАРЭМБА,
выкладчык філалагічнага
факультэта.

НА ЗДЫМКУ: у час канферэнцыі.

Фота В. НАВУМЕНКІ.

# За рукі возьмемся, сябры!

Набыць прыгожыя кіпрскія паштоўкі, алоўкі, эмблемы, значкі, забаўныя цацкі можна не толькі пабываўшы на гэтым цудоўным востраве. Іменна такімі былі выйгрышы латарэі, ветліва прапанаванай мілымі дзяўчатамі з Кіпра, студэнткамі мінскіх ВНУ.

У зале завода медпрэпаратаў у той вечар было шмат цікавага і нечаканага. Поўныя незвычайнага характва гукі народнай музыкі запрашалі гасцей на адкрыццё кіпрскага вечара, прысвечанага 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, барацьбе Кіпра за свабоду і мір. Госці павіншавалі сваіх кіпрскіх сяброў.

А якое ж свята без канцэрта? Выступленні студэнтаў Раджэрыа з Мазамбіка, Эфіці з Уганды, Лукаса з Грэцыі, Костаса і Ледэцэрыса з Кіпра гледачы запомняць надоўга.

Але чароўней за ўсіх была вядучая — студэнтка III курса факультэта журналістыкі Георгія Васіліу. Яна яшчэ дома марыла набыць гэту прафесію і таму прыехала вучыцца ў 1983 годзе ў Савецкі Саюз. Дзяўчыне ўсё было новым і незнаёмым. Але паступова з'явіліся знаёмыя, сябры. Вось ужо сваім стаў Мінск. Вучыцца яна ўвесь час на «выдатна». Займаецца грамадскай работай. «Наша Георгія» — завуць яе на факультэце.

Захапляючая музыка грэчаскага танца зачаравала тых, хто сядзеў у зале. Рухі танцораў былі дакладнымі і ўпэўненымі. Апладысменты заглушалі гукі музыкі. У адказ на выступленне гасцей кіпрыёты прапанавалі свой, не менш натхнёны танец. Гледачы былі ў захапленні.

Бліжэй пазнаёміцца з краінай дапамагалі слайды. Невядомая, але бясспрэчна прыгожая прырода адкрылася гасцям вечара. Помнікі архітэктуры, культуры, цудоўныя пейзажы... А вось закат над акіянам, адкуль выйшла на Кіпр прыгажуня Афрадзіта. Востраў кожнага ўразіць сваім хараством. Трэба толькі добра пазнаць яго, адчуць рытм яго жыцця, палюбіць...

Сваёй любімай справай быў заняты дыск-жакей вечара. І не выпадкова дыскатэка была такой цудоўнай. Выдатна падабраныя музычныя кампазіцыі папулярных груп, цікавая аранжыроўка спадарожнічалі агульнай салідарнасці. Кіпрыёты, беларусы, грэкі танцавалі, узяўшыся за рукі. Гэта быў вечар знаёмства, дружбы, міру.

В. ШУСТОЎСКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

*Вечар дружбы*

# Нам ёсць што расказаць...

У той вечар у інтэрпакоі інтэрната № 2 было надзіва шумна, весела. Падыходзілі ўсё новыя і новыя людзі. На вачах змяняў свой выгляд пакой: накрываліся сталы, шыпуча-свістоўную песню заводзілі чайнікі, развешваліся карты, плакаты.

УСЕ САБРАЛІСЯ. На сярэдзіну пакоя выйшла дзяўчына ў нацыянальным кубінскім адзенні і прывітала прысутных.

Пачынаўся вечар інтэрнацыянальнай дружбы. Такія вечары-сустрэчы са студэнтамі з розных краін сталі традыцыяй на кафедры ядзернай фізікі. Болей дваццаці студэнтаў з Кубы, В етнама, Лівіі і іншых краін займаюцца на гэтай кафедры. У такой немалой інтэрнацыянальнай сям'і зразумелы інтарэс адзін да аднаго.

Нікога не прыйшлося ўгаворваць, калі пайшла гутарка аб правядзенні інтэрвечара з кубінскімі студэнтамі. Рыхтаваліся да яго ўсе. Жадаючых трапіць на вечар было шмат. Пакой здаўся трошкі цеснаватым, але затое не было тут месца суму.

Калі Ганну Беатрыс, студэнтку V курса, папрасілі расказаць пра сённяшні дзень Кубы, яна трошкі сумелася:

— Бадай, адной мне не справіцца,— і ўжо на іспанскай мове звярнулася да таварышаў.

Кубінскія студэнты, хуценька ўзяўшы крэслы, селі насупраць нас. Атрымалася міні-канферэнцыя. Пытанні сыпаліся адно за адным. Нас, савецкіх студэнтаў, цікавіла і сістэма навучання на Кубе, і медыцынскае абслугоўванне, і ўзаемаадносіны паміж краінамі Карыбскага басейна. Мантэра Каяда і Брава Расенда Лопес, студэнты III курса, расказалі пра бейсбол. Прынеслі кубінцы і свае нацыянальныя музычныя інструменты. Загучалі песні: кубінскія і рускія. Так і праляцеў час інтэрвечара.

«Давайце сустрэнемся зноў!» — прагучала такая прапанова ў канцы. Яе дружна падтрымалі, бо гэтая сустрэча не прайшла дарэмна ні для каго. Раней мы сустракаліся на занятках, спрачаліся ва універсітэцкіх калідорах. А тут, на вечары, адкрылі для сябе новае ў сваіх таварышах. Як жа рэдка мы збіраемся за гарбатай і з гітарай! Нам жа ёсць што адзін аднаму расказаць. Думаю, такая форма інтэрнацыянальнага выхавання і карысная, і патрэбная для нас.

М. ГУРЫНОВІЧ,
студэнт фізічнага факультэта.

*Эстафета*

*ЮБІЛЕЙНЫ, трыццаты раз праводзілася традыцыйная лёгкаатлетычная эстафета па вуліцах горада-героя Мінска ў гонар 117-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна. Старт удзельнікам першай групы быў дадзен у 11 гадзін раніцы. І на працягу затым трох гадзін удзельнікі і гледачы знаходзіліся пад неаслабным захапленнем і хваляваннем ад барацьбы, якая вялася на працягу ўсіх 15-ці этапаў эстафеты. Эстафета працягнулася ад плошчы імя У. І. Леніна па Ленінскаму праспекту да плошчы Перамогі. Удзельнікі V і VI этапаў працягвалі змагацца і далей — да плошчы Я. Коласа. За кароткі час у эстафеце прынялі ўдзел прадстаўнікі самых розных калектываў: ад сярэдніх школ, тэхнікумаў і ГПТВ да вытворчых калектываў і ВНУ рэспублікі.*

*Адным з захапляючых па напружанасці і напалу барацьбы быў апошні, шосты этап, у якім прыняла ўдзел каманда БДУ імя У. І. Леніна. Стартаваўшы на І этапе А. Гарбацэвіч (факультэт радыёфізікі, II курс) захапіў лідэрства, якое затым падтрымлівалася на працягу ўсіх астатніх этапаў. За каманду БДУ выступалі прадстаўнікі многіх факультэтаў,*

*Дзякуючы іх волі і жаданню, самаадданасці ў барацьбе Беларускі універсітэт сярод удзельнікаў ВНУ г. Мінска заняў першае месца. Віншуем іх з ганаровай перамогай!*

*А. МАКСІМАЎ.*











САМАКІРАВАННЕ, ЯК РАЗУМЕЮЦЬ СТУДЭНТЫ, ГЭТА — МАГЧЫМАСЦЬ САМАСТОЙНА ВЫРАШАЦЬ ШМАТЛІКІЯ ПЫТАННІ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ. СТУДЭНТАМ НАДАКУЧЫЛА ЧАКАЦЬ, ПАКУЛЬ ПРАСЕЮЦЦА ПРАЗ ІНСТАНЦЫІ НЯВЫРАШАНЫЯ ПРАБЛЕМЫ, І ЯНЫ ШМАТГАЛОСНА ЗАЯВІЛІ: «ХУТЧЭЙ ДАВАЙЦЕ САМАКІРАВАННЕ!».

*Хімфак: ёсць меркаванне*

# ПРАВЕР СЯБЕ СПРАВАЙ

## *Два бакі самакіравання*

ІМЕННА для гэтага на факультэтах праводзілася анкетаванне, збіраліся камсамольскія сходы. Так было і на хімфаку. Выступіў дэкан, сакратар камітэта камсамола. Сход ішоў, як і запланавалі. Толькі ці пасуе да «самакіравання» надта афіцыйнае «запланавалі», ды яшчэ камсамольскі сход? Не! І студэнтам так здалося. Яны падхапілі «свабодны мікрафон» і выказвалі свае абурэнні, гаварылі пра тое, што набалела. Даўно не заўважалася такой актыўнасці камсамольцаў. Аднак пасля амаль чатырох гадзін дыскусіі ў пастанове сходу... нічога канкрэтнага не значылася.

Тады і вырашылі студэнты перанесці гэтае пытанне, разам з вялікай колькасцю іншых, на наступны сход, які павінен адбыцца ў канцы красавіка. А пакуль... Сядзець і чакаць? І скардзіцца на жыццё без цікавай справы? Спраў было шмат. Для іх вырашэння быў створаны «савет васьмі».

### ЦІ МОЖНА ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ?

Не падумайце, што ўзнік савет стыхійна. Справа ў тым, што жыць пад кіраўніцтвам былога камітэта камсамола студэнты факультэта не пажадалі. Не таму, што самаўпраўства было для іх больш выгаднай формай — камітэт не спраўдзіў надзеі.

Ад курса па 2 чалавекі — так ствараўся «савет васьмі». Прадстаўнікі ўзяліся за правядзенне «перадвыбарнай кампаніі» і вырашэнне ўзнікшых пытанняў. Тут неабходна растлумачыць, што «савет васьмі» — гэта не арганізацыя над арганізацыямі, не асобны орган, які аўтаматычна надзяліў сябе небывалымі паўнамоцтвамі. Час дзейнасці савета абмежаваны — да камсамольскага сходу, а задача нялёгкая — паказаць, які стыль работы неабходны і камітэту камсамола, і прафбюро.

Мне давялося прысутнічаць на адным са сходаў савета. Справай студэнты зацікаўлены сур'ёзна. Былі падведзены вынікі анкетавання аб якасці выкладання лекцый на факультэце, абмяркоўваліся інтэрнацкія пытанні. У планах — сустрэчы з камендантам інтэрната, з загадчыкам кафедры фізічнага выхавання, з кафедрамі грамадскіх навук. Праз сустрэчы з кампетэнтнымі асобамі будуць студэнты вырашаць свае праблемы.

Так, вядома, намнога лепей. Пасрэдніку лягчэй сказаць «не», «пачакайце», а студэнт патрабуе справы. Не забывае савет і пра сваю галоўную задачу. Ужо распрацавана новая структура камітэта камсамола, у які замест 23 павінны ўвайсці ўсяго 13 чалавек. Тых, хто сапраўды хоча працаваць. Праводзяцца на патоках камсамольскія сходы, на якіх вылучаюць кандыдатаў.

### ЧАМУ МАЎЧАЦЬ СТУДЭНТЫ?

Не надта станоўча адгукаюцца ў камітэце камсамола БДУ аб асаблівасцях увядзення самакіравання на хімічным факультэце. Катэгарычна выказаўся Б. Лысякоў, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па арганізацыйнай рабоце і аб рабоце савета. Адарванасць ад мас, анархічнасць у працы — вось што ставіцца савету ў віну. А што самі студэнты?

*А. Балабановіч, студэнт III курса:*

— Самакіраванне ў нас уводзіцца. Мы выбіралі «савет васьмі».

*Т. Загній, студэнтка IV курса:*

— Хочацца верыць, што праблемы, узнятыя на камсамольскім сходзе, знойдуць патрэбнае вырашэнне.

Выходзіць, нельга абвінавачваць савет у адсутнасці галоснасці. Ды, на жаль, дапамогі ад студэнтаў няма. Што гэта: інертнасць ці нежаданне браць на сябе адказнасць? Прывыклі, што ўсё вырашае ўсёмагутны «нехта». Гэтую сцяну абыякавасці і трэба ўскалыхнуць, што вельмі і вельмі няпроста.

Вось вам яскравы прыклад. Першаму курсу прапанавалі вылучыць кандыдатаў у новы камітэт камсамола. Справа адказная, а камсамольцы без абмеркавання, асабліва не разважаючы, назвалі пару прозвішчаў. Упэўнена, што таму ж першаму курсу хочацца, каб камітэт камсамола працаваў не абы як. І ў чырвонай скрынцы для прапаноў па паляпшэнню работы нямала пажаданняў.

Зразумела, што перабудова — гэта не проста замена аднаго другім, не вынаходніцтва нейкіх «цудаў». Гэта перш за ўсё пошук сцяжынак да чалавека. Без гэтых жывых нітачак, якія звязваюць лідэра з людзьмі, цяжка гаварыць і пра развіццё дэмакратычных асноў у ВНУ, і пра студэнцкае самакіраванне.

Іменна на гэтыя пытанні патрэбна першапачаткова звярнуць увагу. А то атрымліваецца, што студэнцкія прадстаўнікі выконваюць ролю дэпутатаў, а ўсе астатнія — не пры справе, чакаюць вынікаў.

### САМАЎПРАЎСТВА ЦІ САМАКІРАВАННЕ?

Толькі вольнае наведванне заняткаў! Усе жадалі, каб іменна з гэтага пачыналася самакіраванне. І таму не дзіўна, што на яго пачалі спісваць і недысцыплінаванасць, і абыякавасць. З'явілася думка: усё дрэннае — ад самакіравання. Надта многа волі далі студэнтам. І гэтага нельга адмаўляць. Дрэнна, калі абуджэнне наступае знянацку. «Дрэнны» выкладчык ужо 20-ы год на факультэце, а толькі зараз «заўважылі», што яго лекцыі нецікавыя. Абы як кармілі ў сталоўцы — абураліся між сабой — і толькі. А тут самакіраванне — і ўсё паляцела ўверх дном. Пачынаць заўсёды цяжка. Падагнаць справу да чырвонай даты, зрабіць з яе кампанію ніяк нельга. І без памылак не абысціся. Няма вопыту. І інструкцый, дзе б усё расклалі па паліцах, таксама няма.

«Калі мы здолеем хоць што зрабіць, калі дакажам, што ў нас хапае самастойнасці на сур'ёзныя справы, нам — зялёнае святло,— так лічыць старшыня «савета васьмі» Яўген Салдаценка,— а калі не...».

І каб не было цяжкага «не», неабходны нейкі кантроль за такой адказнай справай і таварыская парада. Прыемна, што з інтарэсам, з увагай аднесліся да студэнцкіх захадаў у партбюро хімфака. Камуністы згодны аказаць любую дапамогу, згодны падтрымаць ініцыятыву.

І ўсё ж студэнтам ні ў якім разе нельга забываць, што зняважлівыя адносіны да навучання самакіраванню толькі пашкодзяць. «Хацелася б, каб перш за ўсё члены «савета васьмі» звярнулі на гэта ўвагу»,— гаворыць сакратар партбюро В. Л. Ламака.

В. КАЗЛОВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

*Ад першай асобы*

У нас у гасцях насценная газета

# „Журналіст" МАЯ ГАЗЕТА

*ТАК, Я ЛІЧУ ЯЕ СВАЁЙ. Мы знаёмы амаль чатыры гады. Спачатку, пры першай сустрэчы, яна ўразіла, нават напалохала сваімі памерамі і формай падачы матэрыялаў. Потым мы працавалі. Я была яе карэспандэнтам, яна — маім настаўнікам. Зараз я — рэдактар, а яна па-ранейшаму дае мне парады, дапамагае набываць майстэрства. За гэты час мы навучыліся разумець адзін аднаго: я, без перабольшання, памятаю кожны яе матэрыял. Яна заўсёды знаходзіцца побач, калі на белым аркушы ніяк не з'яўляецца самы галоўны — першы радок. І падбадзёрвае. І падштурхоўвае да працы. Часам і сама не ўяўляю, дзе заканчваюцца нашы службовыя адносіны і пачынаецца сяброўства.*

*Мне здаецца, усе члены рэдакцыйнай калегіі таксама адчуваюць сябе часткай «Журналіста». Ні адзін нумар не выйшаў бы ў свет, калі б не працавалі над ім адказны сакратар Саша Вальвачоў, загадчыкі аддзелаў Дзіна Міна, Вераніка Пісарэнка, Ала Рубцова, Андрэй Патрэбін, карэспандэнты, няштатныя аўтары (а гэта ўвесь факультэт, супрацоўнікі газет, радыё і тэлебачання), машыністкі і карэктары.*



*Дарэчы, у нашай газеце сем аддзелаў: «Анонс», «Скрыжаванне», «Майстэрня», «Грымёрная», «Калейдаскоп у дадатак», «От/дел № 6», «Калонка рэдактара». Шкада, што нельга зараз прадставіць вам кожны з іх. І таму мы з «Журналістам» чакаем вас на факультэце. Заходзьце, калі ласка!*

*М. ЗАГОРСКАЯ,*
*рэдактар газеты «Журналіст».*

# ВЫБАРЫ



*Атакуем фармалізм*

У ГРУПЕ ВЫРАШЫЛІ правесці справаздачна-выбарны сход. Пасля трэцяй «пары» удалося «злавіць» 13 камсамольцаў. «75 працэнтаў» — задаволена падумаў ужо амаль што былы камсорг (ён адбываў апошнія мінуты) і, прысеўшы за стол, пачаў чакаць куратара. Пасля таго, як куратар упэўніўся, што большая і лепшая частка групы прысутнічае, пасля таго, як куратар, аддаўшы загады, накіраваўся на лекцыю, якая стаяла чацвёртай «парай»,— пасля гэтага вырашылі пачаць сход.

Трымаць справаздачу пра тое, хто што робіць у сваёй камсамольскай арганізацыі, не сталі — усё роўна праз тры дні атэстацыя.

— Галоўнае пытанне парадку дня — выбары новага камсорга і членаў бюро групы,— заявіў былы камсорг. 13 душ панура слухалі, чакаючы страшнага імгнення. Ніхто, шчыра кажучы, не жадаў прымаць на сябе лідэрства.

Таму калі пачаліся выбары, усе сталі наперабой называць прозвішчы. Быццам бы сышліся на адным таварышу. Аднак пасля аднагалоснага выбрання ён заявіў:

— Незаконна! Не па Статуту! У нас і пратакола няма! Вечар гумару нейкі! Сядай, пішы пратакол буйнымі літарамі. Спачатку давай!

Усе згадзіліся. Завялі пратакол. Пісалі па просьбе таварыша буйнымі літарамі. Карацей кажучы, усіх выбралі. І без усякага смеху. Вось якую ўладу мае над людзьмі пратакол. Выбралі і здзівіліся — занадта правільны сход атрымаўся без куратара, ды з пратаколам...

Дзіва дзіўнае! Ды няўжо ж год назад так магло быць? Распаўзліся б, як тараканы. І пратакол не спыніў бы...

А. ПАТРЭБІН.

*А ў вас? А ў нас?*

# ВАКОЛ «КРУГЛАГА СТАЛА»

АЎДЫТОРЫЯ падзялілася на дзве часткі.

— У наш час тэма сама падказвае форму падачы матэрыялу. Нельга журналісту мець вузкую жанравую спецыялізацыю. Трэба ўмець распрацоўваць і іншыя, вучыцца камбінаваць і сумяшчаць, каб у выніку атрымаўся жанр-гібрыд,— даказвалі з упэўненасцю адны.

Другія ж лічылі, што толькі ў адным, «сваім» жанры можна дасягнуць сапраўднага майстэрства.

— Дарэчы, з якой нагоды спрэчкі? — запытаўся б чалавек недасведчаны, але зацікаўлены агульнай узрушанасцю і рашучасцю.

З нагоды прафесійнай размовы, якая адбылася ў студэнтаў II курса факультэта журналістыкі на пасяджэнні секцыі замежных моў студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі. Абмяркоўвалі даклады студэнтаў М. Куноўская, С. Сабіла, П. Сіманава. Гаворка ішла пра рэкламу, рэцэнзію і рэпартаж у газеце англійскіх камуністаў «Морнінг Стар».



Такія тэмы навуковых і курсавых работ даўно ўжо не навіна. Цікава? Так. Складана? Яшчэ як! Да таго ж, кожны даклад выслухоўваецца тут уважліва. Не толькі таму, што і ўдзельнікі, і госці павінны напісаць рэцэнзіі на выступленні сваіх аднакурснікаў, але і таму, што ўжо з самага пачатку дыскусія абяцае быць захапляючай і карыснай, бо пытанні, закранутыя ў выступленнях, вельмі хвалююць будучых журналістаў.

Наогул, калі і гаварыць пра тое, што замежная мова да спецыяльнасці ніякіх адносін не мае, дык гэта не на журфаку. Менна форма правядзення заняткаў на замежнай мове і дапамагае студэнтам, набываючы веды, удасканальваць і журналісцкае майстэрства. Прыняць удзел у «круглым стале», зразумела, на замежнай мове са студэнтамі з Ганы і Уганды, з супрацоўнікам Йоркскага універсітэта Сюзер Пармінтэр, з замежнымі студэнтамі Харыкам Імарам (Індыя), Эфіці Фільямам (Уганда) Джонам Качаланам (Уганда) дзякуючы вынаходлівасці дацэнта Ірыны Фролаўны Ухванавай могуць нават тыя, хто яшчэ не вучыцца ва універсітэце. Таму што пасля кожнай такой сустрэчы застаецца магнітафонны запіс.

— Гэта з'яўляецца добрым дапаможнікам у час вучобы,— лічыць Ірына Фролаўна.

У маі плануецца правесці яшчэ дзве дыскусіі па тэмах «Месца журналіста ў перабудове» і «Перабудова на факультэце журналістыкі». Плануецца відэазапіс.

У. ЧАРНЯКОЎ.

*За адчыненымі дзвярыма*

# Мы ўсе вучыліся патроху...



НАДАР ДУМБАДЗЕ, калі ў яго запыталіся, што такое інтэлігентны чалавек, адказаў так: «Інтэлігентам быў мой дзед, які падымаўся, сустракаючы госця, нават калі ў саклю заходзіла дзіця». Азначэнне цудоўнае. Але няпоўнае, калі казаць пра інтэлігенцыю як пра грамадскую праслойку, да якой, дарэчы, належаць і журналісты. А няпоўнае яно таму, што, акрамя ўнутранай культуры, не шкодзіла б нам, як людзям творчым, валодаць яшчэ і інтэлектам.

— Гэта яшчэ што такое? — запытаецеся вы. А гэта — здольнасць да рацыянальнага пазнання (даведцы прашу верыць — вынайшла ў слоўніку), іншымі словамі, суб'ектыўнае асэнсаванне таго, што назапасіла ў культурнай галіне чалавецтва, пакуль нам з вамі не прыйшла ў галаву думка гэтыя скарбы папоўніць.

Дзе ж можна запазычыць тую суму ведаў аб развіцці мастацтва і культуры, якая неабходна журналісту?

— Дзівак чалавек! — уступае ў спрэчку першакурснік.— А журфак навошта?

Але ж вы яго не слухайце — гэта ён па нявопытнасці такое гаворыць ці па ўспамінах нашых папярэднікаў, якім пашчасціла праслухаць поўны курс лекцый па гісторыі мастацтва. Яшчэ некалькі год назад такі спецкурс існаваў у нас на факультэце. А зараз, слова гонару, аж зайздрасць бярэ! Вельмі ж хацелася б паслухаць лекцыі па гісторыі жывапісу, музыкі, тэатра. Толькі нічога не атрымліваецца. Жаданне? Ёсць. Выкладчыкі? Таксама! Аўдыторыі? Знойдуцца. Гадзін у плане-сетцы... няма. Няма тых самых лекцыйных гадзін, якія па невядомых прычынах у студэнтаў нехта забраў. Іх скарачалі, скарачалі, а потым і зусім выкінулі з нашай вышэйшай адукацыі з нагоды непатрэбнасці. Вось і выходзяць з факультэта маладыя спецыялісты, якія ў большасці сваёй па чутках ведаюць пра Стравінскага, Ван Гога, Вахтангава... Зразумела, можна займацца самаадукацыяй, можна дасягнуць гэтага самастойна, але ж лепей, калі ёсць магчымасць атрымаць сістэматычныя веды, так неабходныя для культуры, шырокай рознабаковай адукацыі, духоўнасці, нарэшце...

Існуе і такі погляд на з'яву: маўляў, пасля гэтых лекцый усе пажадаюць пісаць пра мастацтва, а як жа праблемы сельскай гаспадаркі і прамысловасці? Лічу, што ёсць у гэтым нейкае насаджэнне, ненатуральнасць «прафарыентацыі». Не трэба пазбаўляць нас якіх-небудзь ведаў. Можа, выбраць для таго, каб дабіцца цікавасці да «патрэбных» тэм, які-небудзь другі шлях? Напрыклад, даваць такія ж захапляючыя лекцыі па эканамічнай прапагандзе. А пакуль атрымліваецца так: ведае пра мастацтва меншая колькасць людзей, і пісаць будуць менш. Не, менш не будуць. Горш і менш прафесійна, не маючы базы, будуць.

Дух перамен вітае сёння над журфакам. Будзе вельмі крыўдна, калі перамены абыдуць бокам гэтую праблему. А ў тым, што яна дастакова надзённая і сур'ёзная, сумненняў, здаецца, быць не павінна.

І вазьму на сябе смеласць сцвярджаць, што доўгачаканы курс з'явіцца нарэшце ў раскладзе.

А. КАЗІНІНА.

*Рэха ГПП*

# ХТО Я І НАВОШТА

Вось я і нарадзіўся ў Мінску, у друкарні БДУ, па заказу № 2935 тыражом 10000 экземпляраў. Калі я ўпершыню ўбачыў свет у 1984 годзе, я ззяў, як адпаліраваны фарфор. Спадзяваўся: шмат карысці людзям прынясу!

А зараз? Марылася пра напоўненае жыццё, пра бурлівае мора спраў. Не пашанцавала мне, відаць, бо трапіў я да нейкага нядбайнага студэнта. Ну, самі мяркуйце.

Узяў ён мяне ды закінуў некуды на шафу ў сваім інтэрнацкім пакоі.

Ляжу, збіраюся. Раптам...

Нечая рука моцна і зусім не далікатна схапіла мяне за загрывак і выцягнула на свет божы. Х-хе... Я нібы крылы набыў, другі раз быццам нарадзіўся.

Лістае доўга і нудна, піша. У пакой ускочыў яшчэ адзін студэнт. У руках у яго — вось сустрэча! — мой брацік, кропля ў кроплю на мяне падобны. І тут пачалося нешта недарэчнае. Усё, што было напісана на маіх старонках, пераехала да браткі, а яго скарбы чамусьці скокнулі да мяне.

Потым быў суд. Мяне вынес студэнт, гартаў і чытаў. Ніколі ў жыцці не чуў такога хуткага пераліку спраў: «...палепшыць вучобу... займацца ў гуртках... выпісаць два перыядычныя выданні».

Я, дзівак, ганарыўся — вось аб якой колькасці спраў павінен буду напамінаць студэнту.

Мяне зацвердзілі. І ўсіх іншых таксама. Толькі настрой мой сапсаваўся, бо высветлілася, што мае браткі-блізняты з заказа № 2935 пра тое ж самае, што і я, напамінаць будуць. Арыгінальнай, выключнай натурай быць не атрымалася...

Але я захаваў аптымістычны настрой і чакаў, калі ж пачнецца жывая работа. Эх, ведаў бы, чым усё скончыцца, папрасіў бы мышэй пагрызці мае лісточкі!..

А так зараз ляжу. Успамінаю. Філасофствую. Ды не, не пра выключнасць асабістай натуры. Пра марна страчаны час тых, хто мяне праектаваў, хто эскізы маляваў, хто кіраваў друкарскай машынай. І пра студэнта, якому ўсё роўна, дзе я і што ён пісаў на маіх старонках. Без мяне спраўляецца: у вучобе, у павышэнні эстэтычнага ўзроўню, у... Эх, што тут марна словы губляць! Я лепш адпачну. Казалі, на днях зноў нешта пісаць будуць. Што? А якая мне справа... Нікога ж гэта даўно ўжо не хвалюе.

Скаргі асабістага
комплекснага плана
падслухала і запісала
С. ГОГАЛЬ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
Зак. 1579.
23 красавіка 1987 г.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.